

**Грошы са смецця**

СТАР. 4



**Чым зацікавіць маленькага гледача?**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Кіраўнік дзяржавы неаднойчы падкрэсліваў, што ўсе рашэнні, якія прымаюцца, накіраваны перш за ўсё на падтрымку людзей. І тут важная сацыяльная справядлівасць. Дэкрэт №3 якраз і накіраваны на тое, каб рэалізаваць прынцыпы сацыяльнай справядлівасці. Гэта не эканамічны, не фінансавы дакумент. Дэкрэт — дакумент ідэалагічны».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8981 | ▼ |
| Еўра | 2,0341 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0704 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
17051>
9 771990 763008

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 САКАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 51 (28415)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# КАМЕННЫ ЖЫЦЦЯПІС



Фота БЕЛТА.

Геолагаразведчык, альпініст, майстар спорту СССР па турызме, падарожнік, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Віталь САКАЛОЎ у сваe 80 гадоў — жывая легенда горада Бабруйска. Прыехаўшы ў 1972 годзе ў горад, ён стварыў адзін з наймацнейшых турыстычных клубаў СССР «Мерыдыян». Члены клуба здзейснілі больш за 800 паходаў рознай катэгорыі складанасці, у якіх прынялі ўдзел больш за сем тысяч чалавек. Сакалоў і цяпер арганізуе геолагадаследчыя экспедыцыі за межы краіны. У 2010 годзе ён перадаў гораду калекцыю мінералаў і горных парод «Жывапіс Зямлі», другую па велічыні ў краіне пасля музея землязнаўства геаграфічнага факультэта БДУ. Цяпер Віталь Мікалаевіч — адзін з нямногіх, хто займаецца апрацоўкай вырабаў з каменяў.

■ Разумныя грошы

## ЖЫЦЦЁ Ў КРЭДЫТ ТАННЕЕ

### Для памяншэння пераплат па старых крэдытах банкі нават прапануюць рэфінансаваць даўгі

**Услед за памяншэннем стаўкі рэфінансавання практычна імгненна працягваюць зніжацца і працэнты па крэдытах. За апошнія два месяцы яны зменшыліся яшчэ на 3—8%. У выніку цяпер у банкаў з'явілася досыць вялікая колькасць прапаноў па крэдытах са стаўкай і да 24%. Мінімальная ж стаўка складае 15%.**



### Радасць набыцца за пазычаныя грошы

Зразумела, што самымі папулярнымі ў людзей з'яўляюцца спажывецкія крэдыты на тэрмін да года. Гэта так званыя кароткія крэдыты, якія разлічаны для ажыццяўлення не вельмі дарагіх пакупак. Шэраг камерцыйных банкаў пачаў выдаваць такія крэдыты на тэрмін ад 7 да 12 месяцаў па стаўцы ад 15% да 18% пры выкананні спецыяльных патрабаванняў да заяўніка. У першую чаргу гэта будзе даведка аб даходах, якая сведчыць, што штомесячны «чысты» прыбытак кліента складае не менш за 300—350 рублёў. Для заяўнікаў і паручыцеляў, якія з'яўляюцца кліентамі банка і атрымліваюць заработную плату на яго ж плацежную картку, прадстаўлення даведкі аб даходах не патрабуецца.

Кліент банка павінен мець рэгістрацыю на тэрыторыі краіны, узрост ад 18 гадоў і стаж на цяперашнім месцы працы ад трох месяцаў. Заўважу, што максімальную суму крэдыту вам дадуць толькі ў тым выпадку, калі існуе больш сур'ёзны даход, а стаж складае не менш за год ці нават два.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## ХОЛАД З ПОЎНАЧЫ

### У суботу месцамі чакаюцца моцныя ападкі, а раніцай і ўначы галалёд і галалёдзіца на дарогах

**У Беларусі ў выхадныя будзе дажджліва, ветрана і халаднавата, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Сёння ўдзень будзе даволі камфортна, калі максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 5 да плюс 11 градусаў. Аднак ужо ў выхадныя характар надвор'я зноў пагоршыцца, бо неба зацягне аблокамі, чакаюцца ападкі, узмацненне ветру, а тэмпературны фон панізіцца. Потым у наступныя два дні тэрыторыя краіны трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, якія зміяшчаюцца з паўночнага захаду Еўропы. У суботу на большай частцы тэрыторыі пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай у некаторых раёнах чакаюцца моцныя ападкі, магчымы слабы галалёд і на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла. Удзень будзе да плюс 8 градусаў. У нядзелю кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу прагназуюцца ўжо на большай частцы тэрыторыі Беларусі. Уначы і раніцай слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ўжо ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла, удзень — 1—6 цяпла.

СТАР. 3

# АД ВІНАГРАДАРСТВА ДА РОБАТАТЭХНІКІ

## Прэзідэнт абмеркаваў перспектывы супрацоўніцтва з губернатарам Стаўрапольскага краю

**Літаральна з кожным рэгіёнам Расіі ў нас наладжаны сувязі, па кожным з больш чым 80 суб'ектаў федэрацыі асобна падлічваецца аб'ём тавараабароту. У некаторых выпадках ён вымяраецца сотнямі мільёнаў і нават мільярдамі долараў.**

Учора завяршыўся візіт у Беларусь дэлегацыі Стаўрапольскага краю на чале з губернатарам Уладзімірам Уладзіміравым. Падчас сустрэчы ў Палацы Незалежнасці Прэзідэнт нашай дзяржавы падкрэсліў: Стаўрапольскі край з'яўляецца адным з найбольш перспектыўных эканамічных партнёраў нашай краіны ў Расійскай Федэрацыі.

Летась аб'ём узаемнага гандлю з рэгіёнам склаў 140 мільёнаў долараў. Пасля двух гадоў падзення рост склаў прыкладна 9%.

— Аднак калісьці мы мелі на 100 мільёнаў долараў больш, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, — таму нам яшчэ многае трэба зрабіць для таго, каб аднавіць страчанае, а пасля і дадаць. Я цалкам упэўнены, што Беларусь і Стаўраполле з нашымі магутнымі патэнцыяламі, развітым агракомплексам не задавальняе сітуацыя, якая склалася. Таму ваш прыезд расцэньваю як імкненне істотна дадаць ва ўзаемным гандлі і запусціць новыя перспектыўныя праекты ў галінах, дзе мы цікавыя і карысныя адно аднаму.

Аляксандр Лукашэнка выказаў спадзяванне, што ў перспектыве мы зможам арганізаваць сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці машын, агрэгатаў беларускай канструкцыі — якія неабходны ў Стаўрапольскім краі. Разам з развіццём кааперацыі нашы прадпрыемствы МАЗ, МТЗ, «Амкадор», «Белкамунмаш» гатовы забяспечваць Стаўрапольскі край сваёй прадукцыяй у поўным аб'ёме. Гэта і пасажырская, і грузавая, і камунальная, і дарожна-будаўнічая тэхніка — яна добра вядома ў Расіі.

У аграпрамысловым сектары Беларусь прапануе Стаўрапольскаму рэгіёну сучаснае тэхналагічнае абсталяванне пад рэалізуемыя рэгіянальныя праекты рэканструкцыі малочнатаварных комплексаў. Прынамсі, наша краіна ўжо прайшла гэты шлях і мае адпаведны вопыт, які аказаўся карысным розным расійскім рэгіёнам — нават Сахаліну. Наш бок таксама можа дапамагчы паскорыць тэмпы абнаўлення парка сельгастэхнікі ў Стаўрапольшчыне.

Стаўрапольскі край плануе развіваць вінаградарства. Тут таксама Беларусь можа выступіць надзейным партнёрам — мы можам арганізаваць пастаўкі спецыялізаванай тэхнікі МТЗ.

Яшчэ адзін цікавы кірунак супрацоўніцтва — праектаванне аб'ектаў і будаўніцтва «пад ключ». У нас ёсць і такі вопыт, ён рэалізоўваўся ў розных рэгіёнах Расіі.

— Мы ў гэтым зацікаўлены, таму што гэта будзе своеасаблівая вітрына магчымасцяў Беларусі ў будаўнічым комплексе. Мы гатовы паспаборнічаць у гэтым плане і з расіянамі, і з замежнымі вашымі партнёрамі, — заявіў беларускі лідар.

Важную сферу для ўзаемадзеяння ўяўляе інавацыйны кірунак. Беларускія навукоўцы гатовы далучыцца да рэалізацыі праектаў, якія здзяйсняюць іх стаўрапольскія калегі ў робататэхніцы, рэсурсазберажэнні, геаінфарматыцы, геафізіцы, мікрабіялогіі, біятэхналогіі.

Губернатар Стаўрапольскага краю падзякаваў Прэзідэнту за цёплы прыём. Уладзімір Уладзіміраў паведаміў, што ў рэгіёне хочуць вярнуцца да пытання арганізацыі зборачнай вытворчасці беларускай тэхнікі і яе сэрвіснага абслугоўвання.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ПРЫНЦЫПЫ — ТОЕСНЫЯ

## У Палацы Незалежнасці адбылася сустрэча са старшынёй ПА АБСЕ

**За апошнія гады наша краіна стала ўсё часцей прымаць мерапрыемствы міжнароднага маштабу. Мінск стаў пляцоўкай для перамоў па Украіне, а ўжо сёлета мы прымем сесію Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (ПА АБСЕ). Такім чынам у свеце больш даведваюцца пра Беларусь, фарміруецца імідж краіны як гатовай да дыялогу і здольнай прыняць буйную падзею.**

Але каб скласці аб краіне не прадузятае меркаванне, трэба ў ёй як мінімум пабываць. Ці хоць бы пачуць уражанні ад тых, хто яе наведаў. У ліпені 2017-га на 26-ю сесію ПА АБСЕ ў Мінск прыедзе больш за 300 парламентарыяў з 50 краін свету, якія пасля вернуцца дадому і змогуць расказаць суайчыннікам аб убачаным. Прэзідэнт Беларусі паабяцаў, што будзе зроблена ўсё магчымае для таго, каб гэта была найлепшая ў сваёй гісторыі падобная сесія. Гэта чарговы раз пацвердзіць, што Беларусь прыхільная асноўным прынцыпам Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве у Еўропе. Сэнс тут не толькі ў тым, як будзе арганізавана мерапрыемства (хоць і аб гэтым клапоцяцца). У краіне за гады незалежнасці зроблена нямала: ёсць што пабачыць замежным гасцям.

«Мы пакажам яшчэ раз, што тыя прадузятасці, якія на Захадзе існуюць, а асабліва існавалі, з'яўляюцца надуманымі. Што Беларусь — гэта еўрапейская краіна. І што тут і правоў чалавека, і вярэнства закона, і дэмакратыі ніколькі не менш, чым у іншых дзяржавах Еўропы, у тым ліку Еўрапейскага саюза», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адно надзённае пытанне тычыцца бяспекі падчас правядзення сесіі. Сітуацыя ў Беларусі ў гэтым плане адносна спакойная на фоне тых падзей, што развіваюцца ў свеце. «Я вам абяцаю, што такая ж сітуацыя будзе напярэдадні, падчас і пасля правядзення гэтага мерапрыемства», — сказаў Прэзідэнт. Ён назваў візіт дэлегацыі ПА АБСЕ, што адбываецца ў гэтыя дні, першай ластаўкай у падрыхтоўцы да сесіі.

Для старшыні ПА АБСЕ Крысцін Мутонен прыезд у Беларусь — першы, і ўражанні ад яго станоўчыя. На яе думку, сесія мае значэнне не толькі міжнароднае. Яна дапамагае развіваць узаемасувязі паміж народамі, выбудоўваць, падтрымліваць двухбаковыя кантакты. «Я перакананая, што ўсё неабходнае ўжо зроблена і будзе зроблена для таго, каб асамблея прайшла паспяхова», — лічыць яна.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# ШТО ВАЖНА ДЛЯ КРАІНЫ...

**На гэтым тыдні кіраўнік дзяржавы ўжо праводзіў сустрэчу з дэлегацыяй міжнароднай банкаўскай структуры — Еўразійскага банка рэканструкцыі і развіцця. А ўчора Прэзідэнт прыняў кіраўніка місіі Міжнароднага валютнага фонду па Беларусі Пітэра Долмана. Падчас сустрэчы былі абмеркаваны пытанні супрацоўніцтва нашай краіны з МВФ.**

— Дзякуй, што прыехалі ў Беларусь і прыйшлі па маёй просьбе для таго, каб мы маглі з вамі абмеркаваць літаральна адно-два пытанні, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — І хачу сказаць, што я не перамовы весці вас запрасіў, бо ведаю, што вы актыўна супрацоўнічаеце з нашымі спецыялістамі па праблематыцы адносін з МВФ, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Проста ёсць пара пытанняў, якія я хацеў бы абмеркаваць. Для мяне і краіны яны вельмі важныя. Мяркую, што тыя пытанні, па якіх мы будзем весці размову, яны і ў інфармацыйным плане карысныя для вас, ну і наогул на будучыню, каб вы ведалі пра сітуацыю, якая складваецца ў Беларусі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# СТРАТЭГІЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ

## Парламентарыі Казахстана і Беларусі дамовіліся больш актыўна абменьвацца вопытам у заканатворчай сферы

**Аб гэтым пасля сустрэчы дэлегацый нашых краін паведамілі на брыфінгу ў Мінску старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА і старшыня Мажыліса (ніжняя палата) парламента Казахстана Нурлан НІГМАТУЛІН.**

Старшыня Мажыліса парламента адзначыў, што дзякуючы канструктыўнаму ўзаемадзеянню прэзідэнтаў Казахстана і Беларусі скаардынавана вырашаюцца задачы як у двухбаковым фармаце, так і ў інтэграцыйных аб'яднаннях. «У сувязі з гэтым першачарговая задача парламентарыяў — забяспечыць эфектыўную заканадаўчую падтрымку ўсіх рашэнняў і дамоўленасцяў кіраўнікоў дзяржаў», — сказаў Нурлан Нігматулін. Цяпер, на яго думку, неабходна інтэнсіфікаваць абмен вопытам у заканатворчай сферы паміж профільнымі камітэтамі і пастаяннымі камісіямі парламентаў і паміж групамі па супрацоўніцтве.

Уладзімір Андрэйчанка заклікаў парламентарыяў дзвюх краін больш актыўна падключыцца да аднаўлення тавараабароту.

«Вялікая тэма для размовы — нашы гандлёва-эканамічныя адносіны. У цэлым яны развіваюцца нядрэнна, — адзначыў спікер. — Але насцярожвае той момант, што за мінулы год амаль на 30% упаў тавараабарот». На яго думку, гэта не адпавядае магчымасцям дзвюх краін, і рабочым групам, сфарміраваным у парламентах Беларусі і Казахстана, варта сур'ёзна папрацаваць над гэтым пытаннем.

Уладзімір Андрэйчанка таксама праінфармаваў суразмоўца, што напярэдадні ў Мінску было падпісана пагадненне аб правядзенні ў ліпені 26-й летняй сесіі ПА АБСЕ, у сувязі з чым у сталіцу прыбыла старшыня Парламенцкай асамблеі Крысцін Мутонен. Спікер выказаў надзею, што дэлегацыя Казахстана прыме самы актыўны ўдзел у рабоце летняй сесіі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

## АДНАВІЦЬ ТАВАРААБАРОТ У 1 МЛРД ДОЛАРАЎ

**Такую задачу агучыў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ на сустрэчы з парламенцкай дэлегацыяй Казахстана на чале са старшынёй Мажыліса парламента Нурланам НІГМАТУЛІНЫМ.**

Паводле слоў прэм'ер-міністра, Беларусь зацікаўлена ў як мага больш хуткім прыняцці праграмы сацыяльна-эканамічнага супрацоўніцтва з Казахстанам да 2026 года. «Разлічваем, што ў жніўні ўрадавая дэлегацыя наведае выставу «ЭКСПА» ў Казахстане, і ў ходзе візіту адбудзецца падпісанне дакументаў», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Беларусь і Казахстан запусцілі першую чаргу праекта па стварэнні індустрыяльна-тэхналагічнага парка сельскагаспадарчай і камунальнай тэхнікі, ёсць планы па сумеснай зборцы камунальнай самазвальнай тэхнікі на базе Мінскага аўтамабільнага завода, камбайнаў «Лідаграпраммаш» — у Казахстане. Па ацэнцы прэм'ер-міністра, ёсць добрыя перспектывы супрацоўніцтва ў сферы беспілотнікаў, узаемадзеянні ў касмічнай галіне.

■ На думку дэпутата

# ХІБЫ НЕ Ў ДАКУМЕНЦЕ, А Ў ЯГО РЭАЛІЗАЦЫІ



**Дэкрэт «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» стаў найбольш абмяркоўваемым дакументам у краіне. Нядаўна Прэзідэнт на год прыпыніў спагнанне падаткавага збору і даручыў падрабязней прапрацаваць дакумент. У сувязі з гэтым карэспандэнт «Звязды» пагутарыў са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па заканадаўстве Наталляй ГУЙВІК аб тым, што трэба ў дэкрэце выправіць.**

***— Сёння, гаворачы пра Дэкрэт №3, часцей адзначаюць недахопы, але ж ёсць і плюсы...***

— Тут хібы не ў дэкрэце, а ў яго рэалізацыі. На мой погляд, гэты дакумент наогул трэба было прыняць значна раней. У нас ёсць Канстытуцыя і канкрэтныя артыкулы: напрыклад, у артыкуле 56 гаворыцца, што грамадзяне павінны прымаць удзел у фінансаванні дзяржаўных расходаў шляхам выплаты падаткаў, а ў артыкуле 133 канкрэтна замацавана, што даходы бюджэтаў фарміруюцца за кошт падаткаў, якія вызначаюцца законам. Дэкрэт вызначыў, што ўсе грамадзяне краіны павінны ўдзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных расходаў шляхам выплаты адпаведнага падатку, калі яны не ўдзельнічалі ў гэтым ці ўдзельнічалі менш за 183 дні ў год. Ён таксама дакладна вызначыў катэгорыі людзей, занятых у фінансаванні дзяржаўных расходаў, і тых, хто па сацыяльна ўважлівых прычынах не можа працаваць.

Што да плюсоў, то трэба разумець, што гэта часовы дэкрэт. Калі ў нас стабілізуецца сітуацыя, не будзе сацыяльнага ўтрыманства, усе працаздольныя, законапаслухмяныя грамадзяне будуць працаваць і ўдзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных расходаў, то ён будзе адменены. Яшчэ адзін станоўчы момант заключаецца ў тым, што пры рэалізацыі гэтага нарматыўнага акта выявілі факты ценявой працоўнай дзейнасці. Колькі людзей у нас працавалі на ўласную кішэню, і пры гэтым яны хадзілі па ўрачах, нічога не плацілі і падаткі не выплачвалі? Акрамя таго, ён дапамог легалізаваць індывідуальную працоўную дзейнасць грамадзян, якія гадамі займаліся рэпетытарствам, здавалі арэндныя жыллё, гэта значыць, атрымлівалі даходы, а падаткі не плацілі, хоць мы ўсе абавязаны гэта рабіць. І яшчэ не менш важны момант: дэкрэт дапамог ацаніць сітуацыю на рынку працы і выявіць рэальны паказчык беспрацоўных. Самым пазітыўным складнікам з'яўляецца норма, якая дала мясцовым Саветам дэпутатаў права вызваляць ад выплаты збору грамадзян, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

***— Чаго не хапае дакументу?***

— Як я адзначыла, ёсць пытанні па яго рэалізацыі. Пасля прыняцця дэкрэта было ўпушчана інфармацыйнае поле. Трэба было яшчэ да складання спісаў і рассылкі «лістоў шчасця» ледзь не штодня расказваць і тлумачыць людзям, што такое дэкрэт, якая яго мэта, якія будуць наступствы яго невыканання, якія катэгорыі грамадзян не падпадаюць пад дзеянне гэтага дакумента... Пра гэта трэба было гаварыць адразу ж пасля яго прыняцця і да пачатку яго рэалізацыі. Тады б грамадзяне прынялі ўсе меры па працаўладкаванні. Я лічу, што гэта самы галоўны недагляд.

Вядома ж, за мінулы перыяд трэба было скласці правільную электронную базу, дзе не было б памылак. Ніколі б грамадзяне не сталі абурацца, калі б іх не пакрыўдзілі. Бо дайшло да абсурду — нават памерлым людзям прыходзілі такія лісты або чалавеку, які працуе. Уяўляеце, як адчувалі сябе родныя памерлага, атрымаўшы такі ліст? Вядома, гэта выклікала незадавальненне. Дэкрэт, у цэлым, правільны і справядлівы дакумент, але яго рэалізацыя вымушае жадаць лепшага. Таму цяпер вядзецца актыўная работа па актуалізацыі інфармацыйнага рэсурсу, што дасць магчымасць выключыць памылкі. Адпаведна, рэалізацыю дэкрэта адклалі на год. А за гэты перыяд усім нам — дзяржаўным органам і дэпутатам усіх узроўняў — трэба дапамагчы грамадзянам з працаўладкаваннем, стварэннем новых працоўных месцаў.

***— Як і калі можна забраць грошы тым, хто ўжо заплаціў падатак, але пазней змог працаўладкавацца?***

— Паколькі ўсе падаткі і зборы паступаюць у мясцовыя бюджэты, то і заяву аб вяртанні заплачанага падатку грамадзянін павінен напісаць у фінансавы аддзел гар(рай)выканкама. Калі чалавек працаўладкуецца, то да сваёй заявы ён павінен прыкласці копію працоўнай кніжкі або выпіску з загаду аб працаўладкаванні. Вядома, будуць звяртаць увагу на тэрмін заключанага кантракта або працоўнага дагавора, каб людзі не звольніліся праз дзень пасля таго, як ім вернуць грошы. Калі ўсё гэта будзе зроблена, то суму падатку вернуць.

***— Падатковыя зборы спынілі да 31 снежня 2017 года. Ці значыць гэта, што ў 2018 годзе падатак будуць плаціць адразу за два гады?***

— Тут усё залежыць ад чалавека. Зараз непрацуючым, але працаздольным грамадзянам далі час да 1 студзеня 2018 года, каб працаўладкавацца. Калі яны знойдуць работу да гэтага тэрміну, то за 2017 год падатак плаціць не трэба будзе. Хто не працаўладкуецца да гэтага тэрміну, той заплаціць за два гады.

***— Зборы ад рэалізацыі Дэкрэта №3 будуць накіраваны дзецям. На вашу думку, на што канкрэтна іх лепш аддаць?***

— Гэта мудрае рашэнне — перадаць выплачаныя падаткі ў мясцовыя бюджэты на патрэбы дзяцей, бо мясцовыя органы ўлады ведаюць, куды іх эфектыўна накіраваць. Напрыклад, на падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў да летняга сезона, на што складана было знайсці сродкі.

Акрамя таго, ёсць дзіцячыя рэабілітацыйныя цэнтры, якім патрэбна фінансавая падтрымка.

***— Давайце ўявім, што прайшло пяць гадоў. Застанецца да таго часу дэкрэт ці не?***

— Калі ўсе 4 мільёны працаздольных грамадзян свядома падыдуць да выканання свайго канстытуцыйнага абавязку па ўдзеле ў фінансаванні дзяржаўных выдаткаў, будуць працаваць і плаціць падаткі, то гэты дакумент не будзе існаваць да 2022 года — я думаю, што яго адменяць і раней! Можа, і праз год. Але ўсе грамадзяне павінны свядома падысці да вырашэння гэтай праблемы. Дэкрэт не вечны, гэта наша жыццё.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ На дарозе

# КРЫШТАЛІ НЕ НА ЎПРЫГАЖЭННІ, А НА РАЗМЕТКУ

Як праходзіць падрыхтоўка дарожнай сеткі да вясенне-летняга перыяду

**Пакуль мы радуемся першым цёплым дням, для прадстаўнікоў дарожных службаў пачынаецца па-сапраўднаму гарачы перыяд. Неабходна навесці парадак на прыдарожных тэрыторыях і галоўнае — разабрацца з наступствамі зімы, якая пакідае за сабой след у выглядзе ям і няроўнасцяў на дарогах.**

Па словах **намесніка генеральнага дырэктара ГВА «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Анатоля ЖАМОЗДЗІКА,** зараз на тэрыторыі сталіцы без выхадных і перапынкаў на святы працуе 12 рамонтных брыгад. З пачатку года ўжо былі праведзены ямачны рамонт на 12 тысячах кв. м дарог. Пакуль умовы надвор'я не дазваляюць пачаць бягучы рамонт з поўнай заменай палатна, яшчэ неабходна ажыццявіць абследаванні і дыягностыку, аднак спіс вуліц, дзе ён будзе праведзены, рыхтуецца. Работы пачнуцца ў другім квартале. Ужо вядома, дзе будзе прымяняцца навінка мінулага сезона — пакрыццё з выкарыстаннем шкловалакна, — на вуліцах



Адзінцова, Акадэмічнай, Казінца і Лагойскім тракце.

Пасля заканчэння зімовага сезона можна падвесці вынікі ўкаранення снегаплавільнага пункта, які быў уведзены ў работу ў мінулым снежні. На яго долю прыйшлося каля 90 тысяч куб. м снегу з агульнай колькасцю ў 370 тысяч. Пункт абслугоўвае Заводскі, Ленінскі і Партызанскі раёны, а таксама Шабаны і МКАД. Сёлета праблем з вывазам і ўтылізацыяй снегу не ўзнікла, паколькі зіма была не вельмі багатай на ападкі.

**Начальнік упраўлення праводзення работ і ўтрымання дарожнай сеткі РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр» Дзмітрый ДЗЕМІДОВІЧ** расказаў, што ў гэтым годзе ў Мінскай вобласці на дарогу будзе наносіцца разметка з ужываннем святловяртальных элементаў ад Swarovski — адной з самых вядомых кампаній у свеце, якія займаюцца вытворчасцю і апрацоўкай крышталёў. Дарожная разметка абнаўляецца штогод, на яе ідзе трэцяя частка ўсіх выдаткаў прадпрыемства.

— Ёсць тры тыпы разметкі: тэрмапластык, пластык халоднага нанясення і эмаль. Самы танны спосаб, але недаўгавечны, — эмаль. Яго хапае прыкладна на паўгода. Пластык служыць даўжэй — да пяці-сямі гадоў, але і кошт яго ў разы вышэйшы. Тэрмапластык выкарыстоўваюць на новых або цалкам адрамантаваных участках дарогі, а абнаўляюць разметку эмаллю, — адзначыў Дзмітрый Дземідовіч.

У Мінскай вобласці ўжо ачышчана каля 50% прыдарожных тэрыторый, усе работы вясновага цыкла павінны быць завершаны да 25 красавіка.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■

■ Кар'ерныя перспектывы

# ЗА КРОК ДА РАЗМЕРКАВАННЯ

**Электронная база рэзюмэ выпускнікоў запушчана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.**

— Праект «Cv.bsu.by» уяўляе сабой інтэрнэт-платформу з базай рэзюмэ студэнтаў выпускнога курса. Яго мэта — аптымізаваць пошук першага працоўнага месца, а таксама максімальна спрасціць працэс узаемадзеяння паміж наймальнікам і кандыдатам, — расказала **начальнік упраўлення кадраў БДУ Наталля НЯПЕЎНАЯ.** — Электронны рэсурс мае зручную навігацыю і складаецца з раздзелаў «Рэзюмэ» і «Дакументы». Усе размешчаныя на ім анкеты змяшчаюць апісанне навуковай дзейнасці, узровень валодання замежнымі мовамі, камп'ютарнымі і прафесійнымі навыкамі, а таксама дадатковую інфармацыю пра захапленні, хобі і кантактныя звесткі выпускніка. Натуральна, што размяшчэнне заявак ажыццяўляецца толькі па жаданні самога студэнта. База штодня папаўняецца новымі анкетамі.

А навігацыя сэрвісу дазваляе наймальнікам, у якіх няма часу прыязджаць ва ўніверсітэт, хутка азнаёміцца са звесткамі пра прэтэндэнтаў, падабраць кандыдата з улікам уласных патрабаванняў і запрасіць яго на гутарку.

Праект распрацаваны пры ўдзеле супрацоўнікаў факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ, упраўлення кадраў, Цэнтра інфармацыйных тэхналогій і кампаніі Abiatec.

Трэба мець на ўвазе, што сёлета адбудзецца падвоены выпуск спецыялістаў з ВНУ, якія навучаліся па чатырох- і пяцігадовай праграме вышэйшай школы.

— Таму ўсім службам, якія займаюцца размеркаваннем выпускнікоў, даводзіцца прыкладаць значна больш намаганняў, чым у папярэднія гады, — канстатавала Наталля Няпеўная. — З кожным работадаўцам вядзецца амаль персанальная работа. Пакуль што прагназаваць праблематычна, але мы разлічваем на добры вынік. Між іншым, улічваючы актуальнасць праблемы, яшчэ ў сярэдзіне лютага Белдзяржуніверсітэт правёў адкрыты Рэспубліканскі кар'ерны форум, які наведалі больш як 1200 студэнтаў з усіх універсітэтаў краіны. Яны пазнаёміліся з рэаліямі сучаснага рынку працы, атрымалі каштоўныя рэкамендацыі наконт пошуку працы і набылі, як мы спадзяёмся, карысныя прафесійныя кантакты. Студэнтам трэба зразумець, што знайсці цікавую высокааплатную работу — звышскладаная задача. Займацца пабудовай кар'еры неабходна не за два месяцы да выпуску, а пачынаючы з другога-трэцяга курса. Акрамя таго, неабходна вучыцца правільна сябе прэзентаваць.

Вось толькі адзін нюанс. Што можна запісаць у графу «Вопыт працы», калі працоўнага досведу пакуль няма? Карысная для наймальніка інфармацыяй можа аказацца, напрыклад, тэма дыплома, курсавой ці навуковай работы студэнта, калі яна, вядома, адпавядае вакансіі. Досвед фрылансу або ўдзел студэнта ў цікавых праектах... Міма пэўных дасягненняў, згаданых студэнтам, прайсці будзе проста немагчыма.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

## Улада зноў на сувязі

У гэтую суботу, 18 сакавіка, прамыя тэлефонныя лініі з насельніцтвам традыцыйна пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны. Такія зносіны доўжацца ўжо не адзін год, чыноўнікі гатовы хутка і кампетэнтна адказаць на пытанні беларусаў і вырашыць праблемы, з якімі не атрымліваецца разабрацца самастойна.

**З 9.00 да 12.00 на званкі адказваюць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
старшыня ЛІС Анатоль Васілевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
старшыня ДВОРНІК Уладзімір Андрэевіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васілевіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).


РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает об открытом аукционе по продаже здания хранилища (г. Минск, проезд Масюковщина, 2/3)**

| Наименование | Начальная цена продажи, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|
| Лот №1. Капитальное строение с инв. №500/С-39650. Наименование: А 2/к здание хранилища. Г.п. – 1982. Этажность – 2. Общая площадь – 1 862,4 кв.м. Фундамент – ж/б. Стены наружные и внутренние – кирпичные. Перегородки – кирпичные. Перекрытия – металлические фермы. Крыша – металлочерепица. Полы – бетонные, дощатые, линолеум. Проемы оконные – стеклопакеты ПВХ. Проемы дверные – деревянные, металлические. Наружная отделка – оштукатурено, окрашено. Внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено. Отопление – от котла. Водопровод, канализация – да. Электроснабжение – открытая проводка. Телефон – да | 859 680,00 | 85 960,00 |

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 500000000006001183, расположенный по адресу: г. Минск, прд. Масюковщина, 2, корп. 3. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Пл. 2,168 га. Назначение – эксплуатация и обслуживание здания хранилища. Право аренды по 31.10.2017

Шаг аукциона – 5%

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Ипотека. В случае продажи с публичных торгов (торгов) имущества, являющегося предметом ипотеки, ипотека прекращается в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Аренда. Часть здания хранилища сдается по договору аренды: – 1 788,9 кв.м до 30.11.2017; – 20,0 кв.м до 01.11.2018; - 3,0 кв.м до 03.07.2021

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 18.04.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Здание хранилища) (Лот №1), проводимом 18.04.2017 (Фрунзенский МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 14.04.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Климович Сергей Викторович, тел. +375-(29)-631-77-77

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**


■ Я выбіраю «Звязду»

## Газету чытаю дзеля мовы!



**Так тлумачыць сваю прыхільнасць да «Звязды» мазыранка Алена МІЦУРА, што працуе барменам.**

— У жыцці звычайна размаўляю па-руску, але не хачу забываць пра свае карані. Таму рэгулярна чытаю «Звязду». Ды беларускамоўнасць — гэта не адзінае, што мне даспадобы ў газеце. Падабаецца манера падачы інфармацыі: стрыманая і ўзважаная. Уражвае і разнастайнасць тэм: ад палітыкі і эканомікі да культуры. Аднак прызнаюся, што найбольш ахвотна чытаю артыкулы пра сямейнае жыццё, здароўе, маладзёжную культуру. Хацелася б таксама бачыць больш матэрыялаў, прысвечаных дому і быту. Бо гэта заўсёды актуальна, асабліва для мяне, замужняй дзяўчыны, якой даводзіцца займацца гаспадаркай. Мяне таксама цікавіць тэма асабістых фінансаў: наша сям'я даволі маладая, і нам з мужам даводзіцца вырашаць праблему рацыянальнага размеркавання грошай.

На жаль, на чытанне газеты ў мяне застаецца няшмат часу: я працую ў сферы абслугоўвання, і знайсці вольную хвілінку цяжкавата. Свежыя артыкулы праглядаю ў інтэрнэце, пакуль еду на работу. Але сёлета хачу падпісацца на папяровую «Звязду», і тое ж самае раю ўсім іншым!

## ХОЛАД З ПОЎНАЧЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня да нас завітаюць атмасферныя франты, якія рухаюцца з боку Заходняй Еўропы. Таму ў панядзелак уначы пераважна ва ўсходніх і заходніх раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы стане яшчэ крыху халадней — тэмпература паветра складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, а пры ясным небе паветра можа астываць да мінус 6 градусаў. Аднак удзень будзе 1—7 цяпла, а па паўднёвым захадзе краіны тэмпература паветра павысіцца да плюс 9 градусаў. Дождж і нават мокры снег прагназуюцца і ў аўторак. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Удзень чакаецца плюс 3—10 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да 12 цяпла.

**Увага!** *Вясна сёлета выдалася ранняй. Сіноптыкі падлічылі, што тэмпературны рэжым амаль на месяц апярэджвае каляндар. Сярэдняя тэмпература паветра за першую палову сакавіка прыкладна на 6—9 градусаў вышэй за кліматычную норму для гэтага часу. Снежнае покрыва сышло, але на вадаёмах яшчэ захоўваецца ледастаў з палонкамі і закраінамі. Цяпер ледзяное покрыва актыўна ламаецца. Таму выходзіць на лёд нельга, бо ён нетрывалы і вельмі слабы.*

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Кампетэнтна

## Не хавайце твары пад маскамі

**Затрыманыя 15 сакавіка грамадзяне груба парушылі закон аб масавых мерапрыемствах. Пра гэта паведаміў журналістам афіцыйны прадстаўнік МУС Георгій Еўчар, перадае БЕЛТА.**

Артыкулам 11 закона аб масавых мерапрыемствах забаронена хаваць свае твары пад маскамі. «Падчас акцыі 15 сакавіка асобныя грамадзяне груба парушылі закон аб масавых мерапрыемствах, які забараняе хаваць твары пад маскамі. Супрацоўнікі міліцыі папярэджвалі аб неправамернасці такіх дзеянняў. Аднак законныя патрабаванні праваахоўнікаў грамадзяне праігнаравалі і працягнулі ўдзел у мерапрыемстве менавіта ў масках. З мэтай высвятлення асобы, а таксама магчымай датычнасці да іншых правапарушэнняў было прынята рашэнне аб затрыманні», — сказаў Георгій Еўчар.

Ён таксама растлумачыў затрыманне ў грамадскім транспарце. «Затрыманне ў грамадскім транспарце праводзілася, так як была верагоднасць таго, што правапарушальнікі могуць схавацца. Грамадзяне аказалі супраціўленне, адзін супрацоўнік міліцыі атрымаў траўмы і зараз знаходзіцца на лячэнні ў шпіталі. Усяго за парушэнне закона аб масавых мерапрыемствах было затрымана некалькі дзясяткаў чалавек. У цяперашні час іх дзеянням даецца прававая ацэнка», — распавёў афіцыйны прадстаўнік МУС

■

■ Здарэнні

## Прагнасць загубіла

**Пачуццё бяспекі цалкам страціў магілёўчанін, калі даведаўся, што 70 тысяч расійскіх рублёў, якія ён узяў у доўг у таварыша, фальшывыя.**

Прыяцель сам, напэўна, гэтага спачатку не ведаў, бо папярэдзіў крыху пазней. І параіў — выкінь. Але мужчына цалкам адмовіўся падпарадкоўвацца голасу розуму і пайшоў хутчэй іх траціць. Накупляў планшэтаў і мабільных тэлефонаў з мэтай перапрадаць, а атрыманыя за іх грошы пусціць на свае патрэбы. Але міліцыя перашкодзіла здзяйсненню яго мудрагелістых планаў. Як толькі прадаўцы гаджэтаў пабачылі, што прадавец цалкам сапраўдныя грошы на фальшывыя грошы, праваахоўнікі хутка выйшлі на «вялікага камбінатара». Абвінавачаны віну прызнаў у поўным аб'ёме, аднак суд, улічваючы яго асобу і абставіны справы, прызначыў яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на 2 гады і 6 месяцаў у папраўчай установе адкрытага тыпу з канфіскацыяй маёмасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

# ВЫКІНУЦЬ НЕЛЬГА. ЗДАВАЦЬ

## Новыя-старыя падыходы да тары



**У Беларусі распрацавана галіновая стратэгія абыходжання з камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі (ДМР) да 2035 года. Пра гэта расказаў начальнік упраўлення дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Анатоль ШАГУН. Дакумент ужо падрыхтаваны, у лютым ён прайшоў стадыю грамадскага абмеркавання і быў дапрацаваны, а ў хуткім часе павінен паступіць на разгляд ва ўрад.**

— Мэта стварэння галіновай стратэгіі — выкананне задач, абазначаных у Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця, зацверджанай у 2015 годзе, — расказаў Анатоль Шагун. — Згодна з гэтым дакументам, ужо ў 2020 годзе паказчык перапрацоўкі ДМР павінен складаць 25 працэнтаў ад агульнай масы цвёрдых камунальных адходаў. У 2025 годзе яго трэба давесці ўжо да 35 працэнтаў, а ў 2030-м — да 40. Сёння ён складае 15,6 працэнта. Аналіз сітуацыі з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі паказвае, што для дасягнення гэтых паказчыкаў нам трэба змяніць некаторыя падыходы. Цяпер у Беларусі фактычна развіваецца толькі адзін сегмент работы — так званы рэцыклінг, калі другасная сыравіна збіраецца і перапрацоўваецца ў прыгодны для выкарыстання тавар. Гэта дазволіць нам перапрацоўваць максімальна не больш за 25 працэнтаў агульнага аб'ёму камунальных адходаў за год. У краінах ЕС ёсць і іншыя методыкі, якія дазваляюць забяспечваць да 100 працэнтаў іх выкарыстання. Менавіта ўкараненне новых тэхналогій і з'яўляецца галоўнай мэтай падрыхтаванага дакумента.

Галіновая стратэгія абыходжання з камунальнымі адходамі і ДМР уключае ў сябе пяць ключавых модуляў. Першы прадугледжвае меры па ўдасканаленні існуючай сістэмы збору другаснай сыравіны: мадэрнізацыю сістэмы збору адходаў, пераход на больш прадуктыўныя яго спосабы, аптымізацыю колькасці палігонаў па захаванні смецця, набыццё новай тэхнікі.

Другі модуль прапаноўвае ўкараненне дэпазітнай (залогавай) сістэмы на спажывецкую ўпакоўку. Падобны падыход функцыянаваў у адносінах да шкляной тары ў часы СССР: здаючы бутэлькі ў пункт прыёму, пакупнік вяртаў іх залогавы кошт. Па словах Анатоля Шагуна, тады сістэма мела шмат недахопаў, якія плануецца ліквідаваць у новым праекце. Мяркуецца, што дэпазітная сістэма дазволіць давесці паказчык вяртання тары да 80 працэнтаў (сёння ён складае каля 25 працэнтаў). На рэалізацыю праекта адведзена 1,5—2 гады, ён павінен ахапіць усю краіну. Вяртаць можна будзе не толькі шкляныя бутэлькі, але і ПЭТ-тару, а таксама бляшанкі з-пад напояў.

Трэці пункт стратэгіі датычыцца выкарыстання камунальных адходаў у якасці паліва. Існуюць два варыянты рэалізацыі: або простае спальванне несартаванага смецця, або стварэнне з адходаў, якія не падлягаюць перапрацоўцы, цвёрдага паліва RDF. Асноўным яго спажыўцом з'яўляюцца цэментныя заводы. Урадам ужо зацверджана канцэпцыя выкарыстання RDF на наступныя гады. Чацвёрты модуль закранае аспект выкарыстання біялагічных адходаў. Іх можна адсейваць на першым этапе механічнай сарціроўкі і далей кампаставаць на палігонах замест мінеральнага грунту, што працягвае тэрмін службы такіх пляцовак.

У асобны, пяты, модуль вылучаны рашэнні па абыходжанні з адходамі ў сталіцы. Распрацоўшчыкі дакумента прапанавалі стварыць заводы па спальванні смецця для атрымання з яго цеплавой і электрычнай энергіі. За год у Мінску на захаванне перадаецца каля 1 мільёна тон адходаў, пры гэтым магчымасці па будаўніцтве новых палігонаў вельмі абмежаваны. Акрамя таго, вялікую ролю грае і кошт транспарціроўкі. Завод па спальванні смецця дазволіць у разы скараціць аб'ёмы захавання адходаў (попел і шлак, што застаюцца пасля перапрацоўкі, складаюць усяго 10 працэнтаў ад першапачатковага аб'ёму). Аб'ект такога ўзроўню каштуе вялікіх грошай, таму яго рэалізацыя магчыма пры ўдзеле замежных інвестараў. Арыенціровачны тэрмін ажыццяўлення — пасля 2020 года.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# ЖЫЦЦЁ Ў КРЭДЫТ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Акрамя таго, банкі пачалі цяпер патрабаваць ад кліентаў дакумент воінскага ўліку (для мужчын, якія не дасягнулі ўзросту 27 гадоў). Аднак, мабыць, самым галоўным мінусам танных крэдытаў на спажывецкія патрэбы ад невялікіх прыватных банкаў з'яўляецца тое, што стаўка па такіх пазыках можа змяняцца.

Усё часцей банкі прапануюць акцыі, калі ў рамках супрацоўніцтва з арганізацыямі-партнёрамі стаўкі па крэдытах могуць складаць да 10%—12% у першыя 2—6 месяцаў тэрміну крэдытавання. У буйных сістэмных банкаў ільготны перыяд крэдытавання складае звычайна 95 сутак, калі дзейнічаюць стаўкі да 12%—13%. Праўда, пасля заканчэння гэтага перыяду працэнты па крэдытах звычайна павялічваюцца амаль удвая.

Пры разліку мінімальнай заработнай платы, неабходнай для атрымання крэдыту, банкі, як правіла, да максімальнага плацяжу дадаюць бюджэт пражытачнага мінімуму, плацяжы па іншых крэдытах, растэрміноўку, часам камунальныя плацяжы, аплату паслуг сувязі і плату за арэнднае жыллё. З разлікам максімальна магчымай сумы не ўсё так проста. Методыка для разліку ў кожнага банка свая, у выніку сумы ў розных банках пры адной і той жа зарплаце могуць адрозніваца ў некалькі разоў.

### Грошы на жыллё

Вясной істотна патаннелі і крэдыты на будаўніцтва (рэканструкцыю) індывідуальных жылых дамоў і кватэр. Напрыклад, Беларусбанк прапануе грошы на гэтыя мэты на тэрмін да 15 гадоў. Працэнты па такім крэдыце складаюць суму стаўкі рэфінансавання Нацбанка і тры працэнтныя пункты за фактычны час карыстання. Грошы выдаюцца на суму ў межах да 75% ад кошту будаўніцтва (рэканструкцыі) жылога памяшкання ў межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка. У банку ўдакладнілі, што пры разліку памеру крэдыту пры недастатковай плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка па рашэнні крэдытнага камітэта ў яго сукупны даход могуць уключацца даходы паручыцеляў — блізкіх сваякоў (членаў сям'і) крэдытаатрымальніка (жонкі, мужа, бацькоў, родных братоў (сясцёр), дзяцей, унукаў). Трэба мець на ўвазе, што ў крэдытным дагаворы прапісваецца памер працэнтнай стаўкі ў абсалютным значэнні на дату заключэння крэдытнага дагавора. Пры змене стаўкі рэфінансавання Нацбанка памер працэнтнай стаўкі па раней заключаных крэдытных дагаворах не змяняецца, калі іншае не прадугледжана крэдытным дагаворам. Атрымліваецца, што стаўка не з'яўляецца фіксаванай, але існуюць нюансы.

Іншыя банкі часцей выдаюць крэдыты на будаўніцтва жылой нерухомасці праз механізм безнаяўнага пералічэння грашовых сродкаў на рахунак забудоўшчыка тэрмінам да 20 гадоў. Самая лепшая стаўка па падобнай прапанове складае 18% гадавых. Таксама пад 18% гадавых можна ўзяць крэдыт на набыццё іншай нерухомасці, але тэрмін такой пазыкі складае ўжо 10 гадоў.

### Інвестыцыі ў будучыню

Найбуйнейшыя фінансавыя ўстановы выдаюць сёння крэдыты і на навучанне ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У гэтым выпадку сродкі накіроўваюцца безнаяўным пералікам на рахункі адпаведных устаноў адукацыі.

Пры атрыманні крэдыту на аплату першай адукацыі дзённай формы ва ўстановах вышэйшай адукацыі пазыка даецца пад 20% гадавых з пагашэннем з наступнага месяца пасля заканчэння ВНУ на працягу 5 гадоў. Працэнты выплачваюцца з наступнага месяца пасля выдачы крэдыту. Пры атрыманні першай адукацыі дзённай формы ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі крэдыт гасіцца на працягу 3 гадоў пасля атрымання дыплома.

**У кожным выпадку да афармлення новага крэдыту варта падыходзіць уважліва. Параўноўваць варта не толькі штомесячны плацеж (на што робяць упор банкі ў рэкламе), але і выніковы памер пераплаты.**

Працэнты налічваюцца за фактычны час карыстання крэдытам, а іх памер вызначаецца ў межах гадавога кошту навучання з улікам плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка.

Аформіць заяўку на крэдыт досыць проста. Многія банкі нават прапаноўваюць папярэдне пакінуць заяўку па тэлефоне, на сайце або адразу ў аддзяленні, а пазней, ужо пасля атрымання станоўчага адказу, прынесці неабходныя дакументы ў банк і заключыць дагавор.

### Рэвізія старых даўгоў

На фоне пастаяннага зніжэння працэнтных ставак па крэдытах усё большая цікавасць назіраецца да крэдытаў на рэфінансаванне запазычанасці. Нагадаем, што крэдыт на рэфінансаванне даецца для таго, каб пагасіць запазычанасць па старым крэдыце.

У крэдытаў на рэфінансаванне ёсць свае асаблівасці. Для прыцягнення кліентаў банкі ўстанаўліваюць стаўку, якая звычайна ніжэйшая, чым па нядаўна выдадзеных крэдытах «наяўнымі». Яшчэ адна асаблівасць: банкі рэдка рэфінансуюць уласныя крэдыты, але з задавальненнем «перакупляюць» запазычанасць іншых банкаў. Гэта тлумачыцца проста: важна прыцягнуць новых кліентаў і не моцна змяняць бягучыя ўмовы сваім. Крэдыты на рэфінансаванне цяпер выдаюць 14 банкаў.

Стаўкі і па гэтых крэдытах працягваюць зніжацца. Калі ў пачатку мінулага года стаўка складала 39—42%, то цяпер з'явілася вялікая колькасць прапаноў са стаўкай да 25%. Сёння стаўка па крэдытах на рэфінансаванне старых даўгоў наяўнымі складае ад 18% да 31% гадавых, пры гэтым ёсць велізарная маса прапаноў і да 20%, што ніжэй нават за бягучыя стаўкі па спажывецкіх крэдытах.

За кошт рэфінансавання стаўка па крэдыце істотна зніжаецца (на 15%—18%), штомесячны плацёж робіцца меншым амаль у два разы, а ўвесь тэрмін крэдыту павялічваецца, аднак фактычнага скарачэння выплат па працэнтах звычайна не бывае. Таму ў кожным выпадку да афармлення новага крэдыту трэба падыходзіць уважліва. Параўноўваць варта не толькі штомесячны плацеж (на чым робяць упор банкі ў сваёй рэкламе), але і выніковую суму пераплаты.

### Без страховак і схаваных плацяжоў

Нацбанк накіраваў у камерцыйныя банкі актуалізаваныя рэкамендацыі для павышэння якасці паслуг для насельніцтва. Рэгулятар рэкамендуе банкам даваць поўную і дакладную інфармацыю пра крэдыты, дэпазіты і спадарожныя паслугі.

Нацбанк таксама нагадаў аб празрыстасці крэдытаў: кліентам не трэба навязваць дадатковыя паслугі, пры гэтым павінна быць пісьмовае пацвярджэнне крэдытаатрымальніка аб тым, што ён азнаёміўся з умовамі крэдыту.

Таксама банкам рэкамендавалі выкарыстоўваць пры афармленні дагавораў шрыфт Times New Roman памерам не меншы за 12 пунктаў. Патрабуюць ад іх не навязваць кліентам страхавыя і іншыя паслугі пры заключэнні крэдытных дагавораў. Пры гэтым кліент, які ўсё-такі вырашыў аформіць страхоўку, павінен мець права выбару паслуг як мінімум трох страхавых арганізацый. Банкам таксама рэкамендуюць уключаць у крэдытныя дагаворы ўсе істотныя ўмовы, вызначаныя заканадаўствам, а таксама іншыя ўмовы, якія ўплываюць на суму працэнтаў за карыстанне крэдытам.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

**28 марта 2017 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске**

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инв. №130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инв. №130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций» | Изолированное помещение с инв. №130/D-54080 «Заготовительный цех» | Капитальное строение с инв. №130/С-46621 «Здание проходной с навесом и покрытием» | Изолированное помещение с инв. №130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями» | Капитальное строение с инв. №130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Номер лота** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11А | г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11П |
| **Тип помещения** | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее |
| **Общая площадь (кв. м)** | 3982,2 | 4516,7 | 3351,5 | 81,0 | 3482,1 | 539,0 |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | 1,444 | | | 0,0527 | | 0,1827 |
| **Начальная цена продажи** | 206 828,90 | 234 471,39 | 230 554,37 | 29 950,20 | 199 639,37 | 89 891,85 |
| **Сумма задатка** | 20 682,90 | 23 447,15 | 23 055,45 | 2 995,02 | 19 963,95 | 8989,20 |
| **Затраты на оценку, организацию и проведение аукциона, руб.** | | | | 1585,04 | | |
| **Условия продажи** | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка** | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 $м^2$ каждый. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 $м^2$. Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 $м^2$ каждый. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 $м^2$. Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Одноэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов – 1389 $м^2$, навес – 284 $м^2$, водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальто-бетонное покрытие – 1876 $м^2$ , бетонное покрытие – 2751 $м^2$, линия электропередачи (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Одноэтажное. Состоит: здание проходной – 81 $м^2$, навес – 35 $м^2$. Покрытие асфальтобетонное – 234 $м^2$. Отопление: печь, котел на твердом топливе. Ввод в эксплуатацию – 1979 г. | Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г. | Одноэтажное здание. Канализационная сеть – 73 м, водопроводная сеть – 20,4 м, бетонное покрытие – 701 $м^2$. Ввод в эксплуатацию – 1992 г. |
| **Организатор аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | | | | | |
| **Продавец аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | | | | | |

Аукцион состоится **28 марта 2017 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, в актовом зале.

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/с 3012470120029 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление, код 401, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 27 марта 2017 г. включительно.
3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;
4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.
5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2, с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 27 марта 2017 года включительно, тел.: (80165-37) 16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон +375 (29) 640-80-37**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

**За кадрам**

# ЗАЙЦОЎ ВЫКЛІКАЛІ?

## Як здымаецца «малодшы брат» «Калыханкі»

**Дзіцячая праграма «Дабраранак» па ўзросце і сама яшчэ дзіця — у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» яна выходзіць крыху больш як 3 гады. Зрэшты, нават за такі непрацяглы час творчая група пацвердзіла якасць новага прадукту, атрымаўшы ў 2015 годзе «Тэлевяршыню» за найлепшую ў Беларусі праграму для дзяцей і юнацтва.**

Улічваючы бязлітасныя лічбы рэйтынгаў і патрабавальнасць сваёй аўдыторыі — дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту — тэлевізійнікі рэгулярна абнаўляюць праект, прыдумляючы новых герояў, змяняючы эфірную застаўку і студыйнае афармленне, тэмы і рубрыкі. Маленькія гледачы і іх бацькі, у сваю чаргу, з задавальненнем ідуць на зваротную сувязь з аўтарамі. А «Звязда», скарыстаўшыся магчымасцю, зазірнула на здымачную пляцоўку праграмы і даведалася, аб чым «Дабраранак» расказвае сваім гледачам і чаму нельга абысціся проста мульцікамі.

Бадай, першае, што кідаецца ў вочы, калі пераступаеш парог дзіцячай студыі, — яркая пляма здымачнай пляцоўкі, стол пасярэдзіне і дзве пары доўгіх вушэй над ім. Пад сталом у гэты час ідзе нейкая валтузня і гучыць ціхая гаворка на розныя галасы — здаецца, там хаваецца цэлы лялечны тэатр Карабаса-Барабаса, а не два чалавекі, якія адказваюць за зайцоў Касю і Лесіка. Спачатку, дарэчы, зайцоў было трое, але камп'ютарны герой, сонечны зайчык Ясік, паступова знік з эфіру.



Рэжысёр праграмы выстройвае кадр: расстаўляе рэквізіт і прыбірае ўсё лішняе.



Такую карцінку бачаць з экранаў тэлегледачы...



...а такую — здымачная група «Дабраранка»!

— А хто ў нас зайцы? — цікаўлюся я, пакуль зацягнутыя ў чорнае артысты «ўжываюцца» ў сваіх персанажаў.

— Акцёры вышэйшай катэгорыі сталічнага Тэатра лялек Наталля Кот-Кузьма і Дзмітрый Чуйкоў, — прадстаўляе рэжысёр Аліна Цітовіч. — Калі «Дабраранак», так бы мовіць, аддзяліўся ад «Калыханкі» і ў ім з'явіліся ўласныя, фірменныя персанажы-зайцы, мы праводзілі маштабны кастынг, на якім было вельмі многа прэтэндэнтаў. Улічвалася ўсё: тэмбр голасу, валоданне беларускай мовай, акцёрская харызма... У выніку, я лічу, атрымаўся проста цудоўны і непаўторны тандэм; хто б нас ні глядзеў, прызнаюць, што «вашы зайцы — проста супер». У іх дакладна прадуманыя вобразы і характары: Лесік — разумнік, а Кася — прыгажуня, і нашы акцёры выдатна падтрымліваюць гэта амплуа з праграмы ў праграму.

Нагадаем, з 1 сакавіка ў сувядучыя да зайцоў далучыліся чацвёра мінскіх школьнікаў, якія, паводле задумкі стваральнікаў праграмы, зробяць «Дабраранак» больш цікавым і блізкім для сваіх аднагодкаў. «Мы шукалі самых працаздольных, кемлівых і адказных дзяцей, якія змогуць удзельнічаць у здымках нароўні з дарослымі акцёрамі, — тлумачаць тэлевізійнікі. — Напрыклад, сёння мы здымаем дзве праграмы, а гэта два сцэнарыі старонак па 8 кожны, і іх трэба ведаць ледзьве не на памяць. Плюс, вядома, патрабаванне тэлегенічнасці, раскаванасці перад камерай — і, галоўнае, добрага валодання беларускай мовай! Мы бачылі на кастынгу выпадкі: прыходзіць дзіця, расказвае тэкст па-беларуску, але відавочна, што гэтыя словы проста завучаны механічна, без розніцы, на беларускай або кітайскай мове, і дзеці не разумеюць, аб чым гавораць... І пры ўсім гэтым вядучыя мусілі быць блізкімі па ўзросце да нашых гледачоў».

«Прашарсціўшы» беларускамоўныя гімназіі і прагледзеўшы не адзін дзясятак кандыдатаў, прадзюсары адабралі ў «Дабраранак» двух хлопчыкаў і дзвюх дзяўчынак. Але не спяшайцеся зайздросціць папулярнасці юных вядучых. Безумоўна, дзеля здымак іх раз на тыдзень вызваляюць ад школьных заняткаў — але гэтыя пропускі дзецям даводзіцца адпрацоўваць без усякіх паблажак з боку настаўнікаў. Дый самі здымкі, якія праходзяць на вуліцы Макаёнка, — гэта вам не пяціхвіліннае «сэлфі з зайцамі», а паўнавартасны працоўны дзень акцёра са шматлікімі дублямі, рэпетыцыямі, рэжысёрскімі папраўкамі і ўдакладненнямі. Не кожны дарослы вытрымае!

Зрэшты, як нам па сакрэце расказала сённяшняя вядучая — вучаніца 4 «А» класа 167-й сталічнай школы Варвара Саскавец, яе такі рэжым працы зусім не палохае і не напружвае. Ну, дык на тое Вара і выдатніца, якая, акрамя рускай і беларускай, добра ведае англійскую мову і дадаткова вывучае польскую.

— І што пра твае здымкі кажуць у школе: мабыць, крытыкуюць, асабліва настаўнікі беларускай мовы?

— Не-не, — круціць галавой дзяўчынка, — тут як быццам усё ў парадку. Наогул, у школе многія гавораць, што бачылі мяне па тэлевізары, і ўсім праграма падабаецца.

Таксама праграмы з удзелам Варвары пільна глядзіць яе сям'я, і калі заўважаць пэўныя хібы і памылкі, абавязкова звернуць на гэта ўвагу — не дзеля крытыкі, а каб наступны раз атрымалася лепш.

— А табе самой падабаецца?

— Вельмі! Я люблю здымацца, адчуваю, што камера — гэта дакладна маё. Ужо здымалася ў дзвюх рэкламах, а потым мама ўбачыла аб'яву пра гэты кастынг, ну вось — я і прыйшла.

Тут дзяўчынку выклікаюць «на пазіцыю», і яна з дапамогай нейкай хітрай акрабатыкі ўладкоўваецца побач з зайцамі ў хісткім з выгляду высокім крэсле. Пасля доўгіх перастановак рэквізіту і лялек — так, каб усе героі ўмяшчаліся ў кадр і не заміналі адно аднаму, — Вара атрымлівае строгі наказ трымаць спіну роўна, чуе запаветную каманду рэжысёра: «Пачалі!». Вельмі ўпэўнена, дэманструючы гледачам талерачку з фігурным печывам, школьніца расказвае ў некалькіх словах пра свята Саракі, што традыцыйна адзначаецца ў сакавіку на вясновае раўнадзенства. Пасля культурнага экскурсу і дыялогу з сувядучымі можна крыху разняволіцца ды запрасіць гледачоў на мультфільм.

У новым сезоне і абноўленым фармаце «Дабраранак» запрашае сваіх гледачоў да інтэрактыву — і з задавальненнем прымае званкі, допісы ў сацыяльных сетках, лісты, малюнкі і змайстраваныя дзецьмі вырабы. Адну з дасланых на праграму вясенніх карцінак вядучыя дэманструюць гледачам, заахвочваючы ўсіх далучацца.

— Я пакуль аднясу малюнак у выстАвачную залу, — гаворыць Варвара.

— ВЫставачную! — хорам падказваем мы, дарослыя, і юная вядучая паслухмяна папраўляецца.

— Бачыце, — заўважае рэжысёр, — якое жыццё ў дзіцяці: націскі падобныя, камеры розныя — тут агульны план, там буйны, і трэба не пераблытаць, куды глядзець, кожную памылку даводзіцца выпраўляць і пераздымаць сцэну, — а яна ўсміхаецца і яшчэ пасля дзвюх праграм будзе ўсміхацца.

— Няхай прывыкае да жыцця артыста, — строга гудзе з-пад стала заяц Лесік — Дзмітрый Чуйкоў. Дзяўчынка ў адказ усё гэтак жа адкрыта ўсміхаецца, нібы і не сядзіць у студыі ўжо некалькі гадзін.

Наогул, час на здымках дзіцячай праграмы бяжыць хутка. Ды і ў ранішнім тэлеэфіры, улічваючы бадзёрую зарадку, карысныя парады дзецям ад спецыялістаў (сярод якіх, напрыклад, урачы, псіхолагі, педагогі, прадстаўнікі МНС, супрацоўнікі розных музеяў) і мультыплікацыйныя перапынкі, паўгадзіны праходзяць зусім незаўважна.

Тым не менш «Дабраранак» выходзіць штодня, і кожную раніцу тэлевізійнікам трэба вырашаць няпростыя задачы — мала таго што зацікавіць сучасных дзяцей, для многіх з якіх беларуская мова ці не цяжэйшая за замежную, але і тыдзень за тыднем, месяц за месяцам не паўтарацца ў выбраных тэмах гаворкі. «Так, — пагаджаюцца сцэнарысты праграмы, — па вялікім рахунку, гэта канвеер, і, каб не паўтарацЬ па сто разоў адно і тое ж, мы спрабуем чапляцца не за саміх дзяцей, а за навакольны свет — надвор'е, прыроду, новыя і старыя гульні... І ўсё адно, калі прыходзіць новая думка, перш за ўсё правяраеш: а я пра гэта раней не пісала? А іншыя сцэнарысты (нас на праграме працуе чацвёра)? І толькі тады пачынаеш разгортваць, развіваць тэму далей».

— Мы разумеем, што ёсць сур'ёзныя канкурэнты ў выглядзе расійскіх і замежных чыста мультыплікацыйных тэлеканалаў, — значна лягчэй пад мульцікі накарміць і апрануць дзіця, чым самастойна з ім займацца, — канстатуюць стваральнікі праграмы. — Але ў «Дабраранка» не толькі забаўляльны, але і пазнавальны кірунак, і для нас вельмі важна не толькі паказаць дзецям яркія карцінкі, але і расказаць ім, прычым на зразумелай і правільнай беларускай мове, пра цікавыя, карысныя і проста патрэбныя ў жыцці рэчы.

Да мовы ў «Дабраранка», як і ў тэлеканала «Беларусь 3», наогул падыход прынцыповы і максімальна строгі: рэдактары па некалькі разоў перапраўляюць па слоўніках словы і выразы, значэнне, правапіс і вымаўленне якіх выклікаюць сумненні. «У раздрукаваных для нашых вядучых сцэнарыях вывера на кожнае слоўца, — запэўнівае рэжысёр, — вялікімі літарамі вылучаны правільныя націскі, а калі падчас здымак у нас узнікаюць спрэчкі: «паглядзІм або паглЯдзім», «садавінА ці садавІна», «зімУ ці зІму» — робім паўзу, тэлефануем рэдактарам і ўдакладняем гэтыя моманты, бо мы нясём адказнасць перад дзецьмі — вядучымі і гледачамі».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*



«Зараз мы цябе, брат, паправім», — угаворвае свайго персанажа Дзмітрый ЧУЙКОЎ.

# КІЕЎ: КРОПКІ НАД «І»

**У сталіцы Украіны адбылася сустрэча дэлегацый краін—удзельніц 62-га песеннага шоу «Еўрабачанне».**




Дэлегацыі прадставілі арганізатарам пакеты матэрыялаў, неабходных для падрыхтоўкі выступленняў усіх канкурсантаў. Украінскі бок, у сваю чаргу, прэзентаваў канцэпцыю будучага шоу і макет сцэны, а таксама правёў экскурсію па Міжнародным выставачным цэнтры, дзе і адбудуцца ўсе канцэрты «Еўрабачання-2017». Акрамя таго, арганізатары расказалі, што сёлета ў здымках візітных картак артыстаў будуць задзейнічаны тэлекампаніі ўсіх краін—удзельніц конкурсу, а галоўнай ідэяй гэтых відэаролікаў стануць шчырыя эмоцыі выканаўцаў.

Адной з апошніх вызначылася са сваім музычным прадстаўніцтвам Расія. Літаральна ў мінулыя выхадныя па выніках унутранага адбору было названа імя Юліі Самойлавай. 27-гадовая спявачка — фіналістка расійскага музычнага тэлепраекта «Фактар А» (2013 год) і ўладальніца імяннай прэміі Алы Пугачовай, удзельніца цырымоніі адкрыцця зімовых Параалімпійскіх гульняў-2014, лаўрэатка і пераможца шматлікіх музычных конкурсаў і фестываляў. А яшчэ Юлія Самойлава — інвалід I групы, у яе складаны дыягназ — спінальная аміятрафія Вердынга-Гофмана, і з падлеткавага ўзросту спявачка перасоўваецца толькі на інваліднай калясцы. Пры гэтым яна не прымае шкадавання ў свой адрас, цвяроза ацэньвае ўласныя магчымасці, займаецца любімай справай і дасягае пастаўленых мэт.

Неўзабаве пасля абвяшчэння расійскага ўдзельніка разгарэўся скандал: украінскія ўлады адзначылі, што спявачцы можа быць забаронены ўезд ва Украіну з-за парушэння законаў аб перасячэнні дзяржмяжы — некалькі гадоў таму дзяўчына выступала ў Крыме, трапіўшы туды без спецыяльнага дазволу. Еўрапейскі вяшчальны саюз паведаміў наконт гэтага, што цалкам паважае і разумее законы Украіны, але са свайго боку не мае ніякіх прэтэнзій да расійскай дэлегацыі і не бачыць парушэнняў з яе боку. Канчатковае рашэнне наконт расійскай удзельніцы мусіць быць агучана ў найбліжэйшыя дні.

Адзначым, што ў выпадку станоўчага рашэння праблемы Юлія Самойлава стане далёка не першай артысткай з абмежаванымі магчымасцямі на сцэне «Еўрабачання». Так, у 2015 годзе Польшчу прадстаўляла спявачка Моніка Кушыньска, якая апынулася ў інвалідным крэсле пасля аўтааварыі, а ад Фінляндыі выступіў панк-гурт, усе ўдзельнікі якога мелі затрымкі ў развіцці. Таксама ў 2008 годзе Грузію прадстаўляла невідушчая артыстка Дзіяна Гурцкая.

Дарэчы, што да пераможцы ўкраінскага нацыянальнага адбору — рок-гурта O.Torvald, — то высокае месца ў выніковай табліцы вакалісту Яўгену Галічу і ягонаму калектыву не прадракаюць нават самыя ўпартыя аптымісты. Прынамсі, у абноўленых прагнозах міжнародных букмекерскіх кантор пальма першынства на сёння аддаецца італьянцу Франчэска Габані, які выступае разам... з гарылай (дакладней, з чалавекам у касцюме прымата) і высмейвае перайманне сучаснікамі чужых звычак і каштоўнасцяў.

## Аўторак, 21 сакавіка

### 1 Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Легкадумная жанчына».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Справа жыцця». Дак. фільм.
**0.45** Дзень спорту.
**1.00 Серыял «Жыць спачатку».***

### 2 Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.40** Тэлебарометр.
**9.05, 18.35 Серыял «Апошні з Магікян».***
**10.20, 17.05 Дэтэктыў «Такая работа».***
**11.10, 16.15 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**12.05, 19.40** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.05, 21.25, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05** Горад.
**17.55** «Пра ежу».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.45, 23.55** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.

### 3 Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Дзедкі.
**8.00, 12.00, 20.25** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Зоя». Драма. 1-я серыя.***
**9.10, 13.10 «Бейбарс». Драма.***
**12.15** «Наперад у мінулае».
**12.40, 23.40** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**15.55, 21.05** «Знішчальнікі Другой сусветнай вайны». Дак. фільм.*
**16.35, 21.40 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Дэтэктыў.***
**17.45, 22.50 «Смяротны танец». Серыял. 1-я серыя.***
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Выйсце ёсць». Эвеліна Сакура.
**20.40** «Калыханка».

### 5 Беларусь 5

**8.00** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.40** Час футболу.
**9.20** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Калеў» (Талін) — «Цмокі-Мінск».
**10.55** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Лідсельмаш» (Ліда) — «Ахова Дынама».
**12.30** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Першы паўфінал. Шосты матч. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва-Мінск».
**14.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Гонка праследу. Мужчыны.
**15.20** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.50** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Сёмы матч. (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**18.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Гонка праследу. Жанчыны.
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Другі паўфінал. Шосты матч. ХК «Гомель» — «Нёман» (Гродна). У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**21.30** Спорт-кадр.
**21.55** Баскетбол. Еўраліга. «Бамберг» (Германія) — «Басконія» (Іспанія). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.20** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».***
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Мурка».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.35 Серыял «Салам, Масква».*****
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.20 «Знахар. Паляванне без правіл». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».

**13.50 Баявік «Гангстары ў акіяне».***



**16.05** «Вадзіць па-руску».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.55 Маст. фільм «Вязень замка Іф».***

### МІР

**6.00, 5.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00, 1.15 Маст. фільм «Маё сэрца для цябе».***
**12.30** «Медыцынская праўда».*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».***
**19.20, 4.10 Серыял «Закон і парадак».***
**22.10 Маст. фільм «Заўтра пачынаецца ўчора».***
**0.00 Серыял «Спрут».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.10** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Кранутая».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Кругаварот».**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТВ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Таямнічая Расія».***
**7.10, 8.05 Серыял «Адвакат».***
**8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».***
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».***
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Курортная паліцыя».***
**17.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».***
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Сведкі».***
**21.25 Серыял «Паляванне на д'ябла».***
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Дэманы».***

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Трылер «Адплата».**
**13.00, 19.30 Серыял «Караледўства».**
**14.25 Камедыя «Фантамас».**
**15.55, 19.25, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад» «Мядзведзь Ёгі».
**17.15 Серыял «Каўчэг».**
**18.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Шукальнікі прыгод».**
**22.10 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Ёка».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**8.00, 14.00** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Варонiны».
**9.40** Баявік «Каламбіяна».
**11.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.30, 21.20** Серыял «Кухня-5».
**15.10, 19.00, 00.30** Серыял «Маладзёжка».
**16.20** Серыял «Татавы дочкі».
**18.00, 23.50** «Уральскія пельмені».
**20.10** Серыял «Закрытая школа».
**21.55** Фантастыка «Чужыя на раёне».
**1.00** «Не можа быць!»
**2.00** Серыял «Месяц».
**3.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**4.00** Серыял «Амазонкі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Расказы пра каханне». Маст. фільм.
**12.45** Гітара сяміструнная. «Алёша Дзімітрыевіч. Да пабачэння, друга мой...»
**13.25** Да юбілею Ірыны Антонавай. «Пятае вымярэнне».
**13.55** «Чалавек у прахадным двары». Маст. фільм. 1-я серыя.
**15.10, 22.05** «Боская правасуддзе Олівера Кромвеля». Дак. фільм.
**16.05** «Сацi. Нясумная класіка...»
**16.45, 18.30** Сусветныя скарбы.
**17.00** «Больш, чым каханне». Лідзія Чукоўская і Мацвей Бранштэйн.
**17.40** На канцэртах міжнароднага фестывалю Мсціслава Растраповіча. Максім Венгераў.
**18.45** Жыццё цудоўных ідэй. «Свабодная энергія або нафтавая іголка».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** «Гульня ў бісер». «А. М. Талстой. «Аэліта».
**21.55** «Гіпакрат». Дак. фільм.
**23.00** Да юбілею Ірыны Антонавай. «Адзінота на вяршыні».
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Чэхаў. Цяжкасці перакладу. «Антон Чэхаў». Маст. фільм.***
**1.30** «Аўстрыя. Зальцбург. Палац Альтэнау». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** Тэлеспектакль «Малыш і Карлсан, які жыве на даху».***
**7.30, 8.50, 11.30, 15.40, 17.00, 19.05, 21.40, 23.00, 5.35** Музычная настальгія.*
**8.00** Фільм-канцэрт Марылі Радовіч «Фотаздымак у ліпені». 1987 год.***
**9.00** Фільм-спектакль «Дванаццатая ноч».***
**12.00** «The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2007 год.***
**13.05, 19.15** Маст. фільм «Журналіст».***
**15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**17.15** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Генадзь Хазанаў.***
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Злачынцы: да і пасля перабудовы». 2006 год.*
**23.20** Дак. фільм «Зоркі савецкага спорту».*
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1969. 2-я частка. 2011 год.***
**1.05** Маст. фільм «Мама выйшла замуж».***
**2.30** Канцэрт «Спявае ВІА «Синяя птица». 1979 год.*
**3.00** «Быў час». 2009 год.***
**4.00** Фільм-спектакль «Таблетку пад язык».***

### EuroSport 1

**3.00, 5.00, 12.30, 19.15, 23.00** Біятлон. Кубак свету.
**3.30, 8.00, 11.35** Горныя лыжы. Кубак свету.
**4.00, 20.30, 0.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**6.00, 9.30, 13.00, 17.00, 21.35, 1.10** Веласпорт. «Вуэльта Каталоніі».
**10.30** Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
**14.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету.
**2.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Кінакамедыя

**0.25** Дэтэктыў «Праклён нефрытавага скарпіёна».***
**2.15** Камедыя «Факап, або Горш не бывае».***



**4.10, 14.20, 15.10** «Камедыянты (шоу)».***
**5.20** Камедыя «Самае горшае Раство ў маім жыцці».***
**6.55** Камедыя «Удачы, Чак».***
**8.40** Камедыя «Пад маскай жыгала».***
**10.20** Прыгоды «Чалавек з Рыа».***
**12.25** Камедыя «Гэта пройдзе, але калі?»***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**16.00** Меладрама «Звычка расставацца».***
**17.30** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... зноў».***
**19.30** Камедыя «Защитнег».****
**21.20** Камедыя «Мой сябар Дзед Мароз».*
**22.50** Камедыя «Навіны з планеты Марс».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40, 14.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.05** «Доктар І...»
**8.35, 19.05, 3.10** «20 хвілін». Серыял.
**10.05, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.50** «Варажбітка».
**13.55** «Паралельны свет».
**15.25** «Здзелка».
**16.00** «Натуральны адбор».
**17.00, 21.45** «Рэвізора».
**18.05** «Тайны следства». Серыял.
**20.45** «Ведзьмакі свету».
**22.50** «Гісторыі выратавання».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Паслязаўтра». Фільм-катастрофа.***
**2.00** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 17.45** Прабач за каханне.***
**8.30** Каханне жыве тры гады.***
**10.40** Страчаны рай.****
**13.05** Чарнільнае сэрца.*
**15.15** Інтэрв'ю з вампірам.***
**20.10** Уладар пярсцёнкаў. Дзве крэпасці.*
**23.30** Востраў праклятых.***
**2.10** Дзень сурка.*
**4.10** Незвычайныя прыгоды Адэль.*

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Зялёная карэта.***
**8.15** Неваляшка.*
**10.10** Клінч.***
**12.10** Старая, старая казка.*
**14.05** Мне не баліць.***
**16.05** Адмірал.***
**18.30** Ушчэнт.***
**20.20** Пецярбург. Толькі па каханні.****
**22.35** Уцёкі за марай.***
**0.10** Мантана.***
**2.10** Бумер.****
**4.20** Піянеры-героі.****

### National Geographic

**6.00, 13.15, 21.00, 0.45, 3.45** Гульні розуму.*
**6.50, 20.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.40, 10.55, 14.50** Мегазаводы.*
**8.30, 15.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.***
**9.20, 12.30, 17.55** Антарктыка.*
**10.10, 22.25** Уварванне на Зямлю.*
**11.45, 16.25, 19.25, 23.15, 2.15** Расследаванні авіякатастроф.*
**18.45, 21.45, 1.30, 4.30** Космас: прастора і час.*

### Discovery

**8.00, 14.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00, 19.00** Браты Дызель.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**20.00** Хуткія і гучныя.***
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.***
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***





## ГАНЬБАВАЦЬ У ТАКІХ ВАРУНКАХ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Весніцы** — вароты ў двор, агарод. *«Мы ўвайшлі ў двор — звыклы сабе сялянскі двор, з хлевушкамі, павеццю, весніцамі на прыгуменне»,* — пісаў Кузьма Чорны.

**Вару́нкі** — абставіны, умовы. *Слова, дарэчы, паходзіць ад нямецкага Wahrung.*

**Габляваць** — зразаць тонкі слой з паверхні драўніны. *Напрыклад, габляваць рубанкам дошкі.*

**Ганьбаваць** — выказваць незадаволенне ў адносінах да каго-небудзь.

**Покат** — доўгі, перарывісты гул, грукатанне. *«Палешукі стаялі, ...і дружныя покаты смеху напаўнялі вуліцу»,* — чытаем у Якуба Коласа.

**Пасак** — вузкі доўгі кавалак чаго-небудзь. *Скажам, кроіць скуру на паскі.*

**Падцягнула жывот** — стан, калі вельмі хочацца есці. *Беларусы яшчэ скажуць: жывот да спіны прырос, кішкі марш іграюць. Рускія: голоден, как волк.*

**Паехаць з рогату** — гучна і нястрымна засмяяцца, зарагатаць. *Беларускія сінонімы: брацца за жываты, качацца са смеху. Рускі: хохотать до упаду.*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by

## ■ Тэлесеткі

## Навуковы падыход

**У Год навукі Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі заклікае гледачоў пазнаёміцца бліжэй з беларускімі вучонымі, навуковымі даследаваннямі і перадавымі ідэямі, народжанымі і рэалізаванымі ў нашай краіне. Адбудзецца гэта знаёмства ў фармаце 12-серыйнага цыкла фільмаў «Справа жыцця», прэм'ера якога адбудзецца на «Беларусь 1» 20 сакавіка.**

Як расказваюць стваральнікі фільма, у кожнай серыі падрабязна ідзе гаворка пра адну з яркіх навуковых ідэй, аўтары якіх вылучаны на саісканне Дзяржаўных прэмій у галіне навукі і тэхнікі 2016 года. Напрыклад, першы фільм прысвечаны дасягненням Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак, кіраўнік якога Алег Румо некалі правёў першую ў Беларусі аперацыю па перасадцы печані, а цяпер ужо цэлы калектыў вядучых беларускіх хірургаў здзяйсняе найскладанейшыя аперацыі па комплекснай трансплантацыі, выкарыстоўваючы ўласныя распрацоўкі.

«Часта мы радуемся выніку навуковых даследаванняў, забываючы пра канкрэтных людзей, якія за ім стаяць, — заўважае адзін з суаўтараў праекта «Справа жыцця» Руслан Туркоў. — Наш задачай якраз было паказаць лёсы такіх людзей, улюбёных у сваю справу і аб'яднаных агульнымі памкненнямі, каб суайчыннікі ведалі сваіх герояў у твар».

Фільмы цыклу «Справа жыцця» будуць выходзіць з панядзелка па чацвер у вячэрнім эфіры.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
tselyashuk@zviazda.by

■

## Наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Прысвяціце панядзелак і аўторак размернай працы, пазбягайце перагрузак, лепш не пачынаць новых спраў. У чацвер паспрабуйце не прапусціць важную дзелавую прапанову, якая будзе спрыяць вашай фінансавай стабільнасці. Можаце разлічваць на падтрымку навакольных, але, праўда, вы самі павінны накіроўваць іх энергію ў патрэбнае рэчышча. Тыдзень спрыяльны для асабістага жыцця і зносін з сябрамі. Гэта дазволіць павесяліцца ад душы і даведацца шмат цікавага.



**СКАРПІЁН.** Надыходзіць спрыяльны час для павышэння вашага прафесійнага ўзроўню і аўтарытэту, кар'ернага росту і разумення спецыфікі новай працы. Накіруйце энергію ўнутр сябе і тады вы зможаце лёгка рушыць наперад, калі для гэтага прыйдзе час. У аўторак не прапусціце важную інфармацыю, яна адкрые новыя перспектывы. У чацвер лепш адмовіцца ад паспешлівасці, дзейнічайце ў сваім рытме. У пятніцу спрыяльна пачынаць любыя справы, асабліва сумесна з аднадумцамі. Вашы ідэі знойдуць разуменне тых, хто навокал.



**СТРАЛЕЦ.** Пакуль не настаў час для адпачынку, цяпер трэба прыкласці намаганні для таго, каб завяршыць справы, якія вы доўга і ўпарта адкладалі. Магчыма, вам здаецца, што з імі немагчыма справіцца. Не падайце духам, пачніце з малога, і крок за крокам вы зрушыце гару з месца. Яшчэ і нядрэнна зарабіце. Не варта рабіць усё ў адзіночку, вакол вас поўна людзей, гатовых дапамагчы, трэба толькі намякнуць ім пра гэта.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні вы пакажаце навакольным прыклад вытрымкі і прафесіяналізму. Гэта выдатны час, асабліва для людзей творчых прафесій. Уважліва сачыце за атмасферай у калектыве, паспрабуйце не ўдзельнічаць у інтрыгах. На працы неабходна дакладна выконваць указанні, бо магчымыя рознагалоссі пры праверкі і выпрабаванні, якія вы зможаце прайсці з годнасцю. Пакіньце прэтэнзіі да дзелавых партнёраў і паглядзіце на сітуацыю з іншага боку. Новы праект аб'яднае вас і ліквідуе рознагалоссі. Выхадныя правядзіце з сям'ёй.



**ВАДАЛЕЙ.** Наступае спрыяльны перыяд для абнаўлення. Калі вы не будзеце ленавацца, то зможаце пахудзець, і вывучыць замежную мову, і змяніць імідж. У першай палове тыдня не распыляйцеся на дробнае і імгненнае, памятаеце, што ваша сіла заключаецца ў магічным, падсвядомым уплыве на навакольных. У пятніцу не будзьце занадта крыўдлівыя, рызыкуеце згубіць выгадную прапанову. Вы схільныя занадта ідэалізаваць усё, што адбываецца, і ганяцца за ўласнымі фантазіямі. У нядзелю не варта высвятляць адносіны з блізкімі людзьмі.



**РЫБЫ.** Дазвольце сабе паменш гарэць на працы, яна нікуды ад вас не дзенецца. Лепш накіруйце свае сілы на тое, каб наладзіць асабістае жыццё, прынесці радасць сабе, родным і блізкім. Не затрымлівайцеся звышурочна, адмоўцеся ад далёкіх і складаных камандзіровак. Выхадныя лепш правесці дома, шумныя кампаніі могуць вас стаміць.

## Чацвер, 23 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.20** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Легкадумная жанчына».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.35** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Справа жыцця». Дак. фільм.
**1.10** Дзень спорту.
**1.25 Серыял «Жыць спачатку».***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.40** Тэлебарометр.
**9.05, 18.50 Серыял «Апошні з Магікян».***
**10.20, 17.25 Дэтэктыў «Такая работа».***
**11.20, 16.30 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**12.15, 19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.05, 21.25, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.45** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**18.15** «Пра ежу».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Дамашнія напоі і шарлотка.
**8.00, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Зоя». Драма.***
**9.10, 14.25 «Цішыня». Драма. Частка першая.***
**10.45** М/ф.0
**11.00** «Гітара па крузе».
**12.15** «Наперад у мінулае».
**12.40** «Мазгавы штурм». Навукова-пазнавальны тэлечасопіс.
**13.05, 23.40** «Дыя@блог». Пра мову.
**13.30** «Эпоха». Напалеон Орда.
**15.55, 21.05** «Знішчальнікі Другой сусветнай вайны». Дак. фільм.*
**16.35, 21.40 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Дэтэктыў.***
**17.45, 22.50 «Смяротны танец». Серыял.***
**19.30** «Музеі Беларусі». Гомельскі палацава-паркавы ансамбль.
**19.55** «Тэатр у дэталях». Спектакль Драматычнага тэатра Беларускай Арміі «Не пакідай мяне».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** Слэм-данк.
**8.25** Козел пра футбол.
**8.45** Баскетбол. Еўраліга. «Рэал» (Іспанія) — «Барселона» (Іспанія).
**10.35, 21.45** Тэніс. Турнір WTA. Маямі.
**12.40** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. «СКА-Мінск» — БГК імя Мяшкова.
**14.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Манака» (Францыя) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
**16.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Барселона» (Іспанія) — ПСЖ (Францыя).
**18.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.
**18.50** Авертайм.
**19.20** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. Фінал. Першы матч. (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.20** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».***
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Мурка».***



**23.25 Серыял «Салам, Масква».****
**0.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.20 «Знахар. Паляванне без правіл». Серыял.**
